# КАЛЕКЦЫЯ ТВОРАЎ М. А. УРУБЕЛЯ Ў ЗБОРЫ НАЦЫЯНАЛЬНАГА МАСТАЦКАГА МУЗЕЯ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ
# THE COLLECTION OF WORKS BY M. A. VRUBEL FROM THE FOUND OF THE NATIONAL ART MUSEUM OF THE REPUBLIC OF BELARUS

Томашава Іна Рыгораўна,
Мінск, Беларусь

Ключавыя словы: М. А. Урубель, Нацыянальны мастацкі музей Рэспублікі Беларусь, Н. І. Забэла-Урубель, тэатр С. І. Мамантава.

Рэзюмэ. Артыкул прысвечаны аналізу твораў М. А. Урубеля ў зборы Нацыянальнага мастацкага музея Рэспублікі Беларусь як цэльнай і разнастайнай калекцыі, у склад якой уваходзяць жывапісныя і скульптурныя творы, звязаныя з асабістым лесам мастака і ягонымі музычна-тэатральнымі захапленнямі.

Keywords: M. A. Vrubel, the National Art Museum of the Republic of Belarus, N. I. Zabela-Vrubel, the theater of S. I. Mamontov.

Summary. The article is dedicated to the works by M. A. Vrubel from the found of the National Art Museum of the Republic of Belarus. This is a complete and versatile collection which includes paintings and sculptures by the master. This collection is connected with his personal life and musical and theatrical hobbies.

5 сакавіка 2021 года споўнілася 165 год з дня нараджэння выдатнага рускага мастака М. А. Урубеля, асоба якога лічыцца адным з сімвалаў рускага мастацтва мяжы XIX-XX стст. Нацыянальны мастацкі музей Рэспублікі Беларусь мае надзвычай цэльную і разам з тым разнастайную калекцыю твораў гэтага таленавітага майстра. У сукупнасці з вялікім шэрагам іншых узораў рускага мастацтва, якія захоўваюцца ў нашым музеі, яны з'яўляюцца істотнай і вельмі каштоўнай часткай нацыянальнага музейнага фонду Рэспублікі Беларусь. У гэтым артыкуле мы прапануем сціплы аповед аб "беларускіх" шэдэўрах Урубеля, якія воляй лесу (а яшчэ больш, дзякуючы ўпартай шматгадовай збіральніцкай працы супрацоўнікаў НММ РБ) ужо больш як за палову стагоддзя належаць да культурнай спадчыны нашай краіны і пленна працуюць на міжнародны аўтарытэт нашага музея.

Шлях, якім М. А. Урубель крочыў у жыцці і творчасці нельга назваць легкім. Хутчэй наадварот. Заўзяты рок наканаваў мастаку кароткае жыцце - толькі 54 год, з якіх на долю творчасці прыпала і таго менш - крыху болей за 20… Спачатку ўсе вельмі зацягвалася: прафесійна займацца мастацтвам Урубель пачаў толькі калі за плячыма застаўся юрыдычны факультэт Пецярбургскага універсітэта. А напрыканцы аж 8 гадоў жыцця зрэлага мастака было амаль цалкам скарнана вераломнай хваробай… Здаецца, што Ўрубель падспудна адчуваў сваю абмежаванасць у часе і можа таму кожны ствараемы вобраз насычаў здіўляючай энергетычнай і сэнсавай спрасаванасцю.

З названых дваццаці год, бадай, самым светлым перыядам у жыцці Урубеля стала другая палова 90-х гадоў; час, калі мастак абсталяваўся ў Маскве (з перыядычнымі наездамі ў Пецярбург і Кіеў), працаваў у Рускай часнай оперы і абрамцаўскіх майстэрнях С. І. Мамантава; час, калі яго, нарэшце, спасцігла шчаслівае каханне. Менавіта ў гэтыя гады і з'явіліся на свет усе тыя творы майстра, якія зараз належаць нашаму музею.

Сярод іх есць і графіка, і жывапіс, і дэкаратыўна-прыкладное мастацтва, і скульптура, але названы шэраг успрымаецца як сапраўдная міні-калекцыя, экспанаты якой аб'ядноае не толькі асоба іх аўтара і адзіная храналогія, але больш таго - тая атмасфера, у якой луняў творца пад час іх стварэння, дзівосная атмасфера суіснавання тэатра, музыкі і ягоных надзей, яшчэ не парушаных будучымі стратамі.

Найбольш яскрава аб гэтым сведчаць партрэты мастака. Добра вядома, што Ўрубеля як партрэціста перш за ўсе цікавіла драма чалавечай асобы і таму ў сваіх творах нават жаночыя вобразы мастак надзяляў дастаткова адчувальнай гараччу. Але двайны тэатралізаваны партрэт "Гензэль і Грэтэль" (1896) - гэта той, бадай, адзіны выпадак, калі лірычныя пачуцці відавочна перамаглі. Увасабляючы на палатне вобразы маладых і таленавітых актрыс Т. С. Любатовіч (у ролі Гензеля, злева) і Н. І. Забелу (у ролі Грэтель, справа), мастак не ўтойвае таго, што на гэты раз яго пэнзлем кіруе сапраўднае каханне.

З Надзеяй Забелай Урубель пазнаеміўся зімой 1895 года на рэпетыцыях спектакля-оперы Э. Гумпердінка "Гензель і Грэтель", да якога мастак ствараў дэкарацыі. Па некаторых звестках Урубель, які быў сапраўдным меламанам, спачатку ўслыхаў дзівосны голас спявачкі і закахаўся ў яе, яшчэ не бачыўшы дзыўчыну [1;202]. Прыняўшы заляцанні закаханага мастака, Надзея ігрыва заўважыла, што пойдзе за яго замуж толькі калі ен напіша яе партрэт. Так спантанна і нарадзілася ідэя незвычайнага партрэта.

Створаныя мастаком вобразы дзяўчат-дзяцей кранаюць сваею адкрытасцю да міру і чуллівасцю адзін да аднаго. Шчыльна прытуліўшыся, як сапраўдныя брат і сястра, актрысы нібы ўвасабляюць сваім дуэтам тую надзею на сяброўства і каханне, якой жыў ў гэты час аўтар партрэта. Асабліва цікавым атрымаўся вобраз Надзеі-Грэтель. Лукава усміхаючыся, дзяўчына пытліва ўглядаецца ў кагосьці (у мастака?). Музычнасць і артыстызм складаюць самыя прывабныя рысы яе асобы. А жывапісная манера Ўрубеля, ягоны знакаміты мазаічны мазок і эмацыянальныя колеравыя спалучэнні, здаецца, выяўляюць тую нецярплівасць, якую адчуваў падчас працы закаханы майстар… Верагодней за ўсе, партрэт спадабаўся Н. І. Забеле, бо летам 1896 года мастак і актрыса ажаніліся.

З гэтага часу музыка для Ўрубеля па-сапраўднаму стала амаль што лесам. У 1989 годзе ен пасябраваў са знакамітым рускім кампазітарам М. Рымскім-Корсакавым, які ў гэты час шчыльна супрацоўнічаў з тэатрам С. Мамантава. Рымскі-Корсакаў, аўтар цэлага шэрагу цудоўных опер на рускія казачныя і былінныя сюжэты, высока цаніў талент Н. І. Забэлы-Ўрубель і галоўныя жаночыя партыі ў сваіх музычна-драматычных творах пісаў менавіта для яе лірыка-каларатурнага сапрана.

Ў знакамітай оперы "Садко", прэм'ера якой адбылася ў тэатры Мамантава 26 студзеня 1897 года, Н. І. Забела-Ўрубель з вялікім поспехам выконвала ролю дачкі Марскога цара, казачнай прыгажуні Валховы. Дэкарацыі да спектакля ствараў Ўрубель. Натхнены паэтыкай быліны, чароўнай музыкай і тэатральным відовішчам,

мастак паралельна выканаў і некалькі станковых твораў на ўзгаданы сюжэт. Сярод іх - манументальнае пано "Садко" (1898-1899).

Цікава, што з усей казачнай гісторыі пра наўгародскага гусляра самым натхняльным для мастака падаўся сюжэт начных спеваў Садко на беразе Ільмень-возера. Урубель як ніхто ведаў, што музыкальны талент - гэта цуд, які можа вызваць да жыцця нават водныя глыбіні. І таму ў сваім творы мастак акцэнтуе ўвагу перш за ўсе на азерных водах, якія нібы прачынаюцца пад спевамі Садко і выпускаюць са свайго палону шэраг марскіх царэўнаў у бліскучых каронах.

М. Урубеля, як аднаго з бацькоў рускага сімвалізму [2;47], заўседы вабіла тая форма жыцця, якая існуе на мяжы рэальнасці і фантастычнасці. Менавіта ў гэтай прасторы нараджаліся лепшыя алегарычныя вобразы майстра, велічныя і таямнічыя. Пры гэтым мастак адчуваў, што містычная і ірацыянальная атмасфера заўседы тоіць у сябе толіку небяспекі для чалавека, і таму ў яго творы рамантычнае спалучэнне фіялетавай ночы і бурлівай воднай стыхіі - нібы два "акны" ў недасяжнасць - не толькі прываблівае, але і непакоіць.

Па матывах опер М. Рымскага-Корсакава акрамя жывапісных твораў Ўрубель стварыў цэлую серыю скульптурных вобразаў. Сярод іх ужо вядомы нам Садко, а таксама велічны Марскі цар і журботная Купава (усе выкананы ў тэхніцы майоліка і датуюцца 1899-1900 гг.). Вельмі паказальна, што да скульптуры Ўрубель падыходзіў як мастак-жывапісец. Ен імкнуўся насыціць пластычныя аб'емы мяккасцю і падкрэсліць амаль няўлоўную характарыстыку вобразаў арыгінальным колеравым рашэннем.

Тэатральнасць, музычнасць, дэкаратыўнасць - характэрныя рысы яшчэ аднаго твора мастака са збораў НММ РБ - "Партрэта К. А Атэра" (1898), знакамітай іспанскай танцоўшчыцы і экстравагантнай прыгажуні, якая з поспехам гастраліравала ў Пецярбурзе ў канцы 1890-х гадоў. Уражанні ад яе выступлення натхнілі Ўрубеля на стварэнне неардынарнага партрэтнага вобраза, у якім рысы канкрэтнай асобы набылі вышыню гераічнага кшталту і, што яшчэ больш цікава, увабралі ў сабе істоту самаго майстра.

Мы ведаем, што Ўрубель марыў аб свабодным існаванні творчай асобы, ратаваў за рашучасць і імгненнасць душэўнага парыву, грэбаваў быційнай старонкай жыцця і мроіў аб недасяжным, шукаў зачаравання ў зіхаценні каштоўных колераў - аб усім гэтым (аб самім сабе!) жадаў паведаць мастак, калі пасля канцэрта з удзелам Атэры, зачыніўшыся ў доме Мамантава пачаў працаваць над партрэтам.

Зараз нам здаецца, што ў гэтым творы Ўрубель здолеў выказаць усе свае гарачыя пачуцці, але сам мастак - прыкмета сапраўднага творцы - застаўся незадаволеным. Амаль скончаны твор Урубель схаваў за шафу і забыўся аб ім. Праз нейкі час у доме адбыўся рамонт, які абярнуўся для палатна сапраўднай трагедыяй. Яго запырскалі мелам і клеям і толькі дзякуючы пазнейшай, вельмі складанай рэстаўрацыі твор займеў новае жыцце [3;105].

У сучаснай калекцыі Нацыянальнага мастацкага музея знаходзіцца сем твораў М. Урубеля і кожная з іх успрымаецца як сапраўдная жамчужына рускай культуры "срэбнага веку", квінтэсэнцыя не толькі асабістых споведзяў майстра, але і эпахальных прадчуванняў.

Літаратура

1. Константин Коровин вспоминает... / Сост., авт. вступ. ст. [с. 3-20] и коммент. И. С. Зильберштейн, В. А. Самков. - [2-е изд., доп.]. - М.: Изобразит. искусство, 1990. – 606 с.

2. Сарабьянов, Д. История русского искусства конца XIX- начала XX века / Д. Сарабьянов – М.: Аст-пресс, 2001. – 304 с.

3. Марченко, Н. П., Зеленой, К. В. Лица и судьбы. Портрет XVIII - начала XX века в собрании Национального художественного музея Республики Беларусь / Н. П. Марченко, К. В. Зеленой - Минск: Четыре четверти, 2002. - 152 с.